УДК 395(161.3)



**І.Г. БАЧЫЛА**, канд. гіст. навук,
старшы выкладчык кафедры этналогіі, музеялогіі і
гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта,
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

*Статья поступила 28 марта 2018г.*

# КАФЕДРА ЭТНАЛОГІІ, МУЗЕЯЛОГІІ І ГІСТОРЫІ МАСТАЦТВАЎ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ: ВОПЫТ ПАЛЯВЫХ ЭТНАГРАФІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

*Артыкул прысвечаны аналізу дзейнасці кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ у галіне правядзення палявых этнаграфічных даследаванняў. Аўтар характарызуе актуальнасць, методыку і тэматыку экспедыцыйнай працы, раскрывае яе геаграфію, пазначае асноўныя вынікі працы ў «полі», знаёміць з апублікаванымі палявымі матэрыяламі.*

***Ключавыя словы:*** *этналогія, палявыя этнаграфічныя даследаванні, экспедыцыя, кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, Беларусь.*

Адным з асноўных метадаў вывучэння культуры этнасаў з’яўляюцца палявыя даследаванні. Гэты метад стаў шырока практыкавацца з сярэдзіны XIX ст., не згубіў ён сваёй актуальнасці і на сучасным этапе. Выкарыстанне ў навуковых этналагічных працах палявых матэрыялаў, сабраных даследчыкам асабіста, значна павышае навуковую значнасць яго работ. Таму авалодванне навыкамі палявых даследаванняў з’яўляецца неад’емнай часткай у працэсе падрыхтоўкі прафесійных этнолагаў.

З самага пачатку існавання (2001 г.) кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў на гістарычным факультэце БДУ яе выкладчыкі рэгулярна ладзяць палявыя этнаграфічныя даследаванні ва ўсіх гістарычна–этнаграфічных рэгіёнах Беларусі. З методыкай і практыкай работы ў «полі» студэнты знаёмяцца ў межах спецыяльнага курса «Метады палявых этнаграфічных даследаванняў», які распрацаваны і чытаецца загадчыкам кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, прафесарам Т.А. Навагродскім. Праграма спецкурса прадугледжвае вывучэнне гісторыі палявых даследаванняў, падрыхтоўку экспедыцыі, арганізацыю палявых этнаграфічных даследаванняў, вядзенне палявой дакументацыі. Шмат увагі надаецца складанню апытальнікаў па самых розных праблемах беларускай этналогіі (разнастайныя аспекты матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры, этнічныя групы на Беларусі).

Правядзенню кожнай экспедыцыі папярэднічае змястоўная і карпатлівая падрыхтоўчая праца. Яна складаецца з двух этапаў. Першы – навуковая падрыхтоўка, другі – матэрыяльнае забеспячэнне экспедыцыйнай працы. У межах навуковай падрыхтоўкі высвятляецца, што ўжо вядома па абранай тэме (тэмах) экспедыцыі, вызначаюцца мэты і задачы будучай палявой працы. Для гэтага вывучаецца спецыяльная літаратура, па магчымасці праводзіцца праца з музейнымі прадметамі. Асобная ўвага звяртаецца на геаграфію раёна, у якім будуць праводзіцца даследаванні, яго лагістычныя магчымасці. Навуковая падрыхтоўка экспедыцыі завяршаецца складаннем яе праграмы, а таксама апытальнікаў. Асаблівую карысць апытальнікі прадстаўляюць для тых, хто толькі пачынае сваю працу ў «полі».

Этап матэрыяльнага забеспячэння будучай экспедыцыі праводзіцца не менш дбайна. Г. Громаў адзначаў, што «если археологов образно называют историками, вооруженными лопатой, то этнографа можно назвать историком, вооруженным фотоаппаратом и блокнотом» [1, с. 20]. У сувязі з тым, што аснашчэнне этнаграфічных экспедыцый імкліва пашыраецца і ўдасканальваецца, то за-

ПолесГУ

мест блакнота выкарыстоўваецца дыктафон (некаторыя палевікі выкарыстоўваюць іх адначасова), важнае значэнне таксама мае пытанне забяспечанасці экспедыцыі электроннымі носьбітамі, ноутбукамі, планшэтамі. Кожны дзень па завяршэнні працы ў «полі» ўдзельнікі экспедыцый пераводзяць сабраныя аўдыёматэрыялы ў тэкставы фармат, абавязкова афармляючы так званы «пашпарт інфарманта».

Падчас палявых этнаграфічных даследаванняў іх удзельнікамі выконваюцца розныя віды работ: асабістае назіранне, апытанне мясцовых жыхароў, збор этнаграфічных прадметаў, фотафіксацыя вынікаў назірання, апрацоўка сабранага матэрыяла, яго расшыфроўка і набор, складанне легенд для кожнага сабранага прадмета.

Штогод для правядзення палявых этнаграфічных даследаванняў супрацоўнікамі кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў выбіраецца новае месца. Дзякуючы загадчыку кафедры, прафесару Т.А. Навагродскаму, досвед палявых этнаграфічных даследаванняў актыўна папулярызуецца сярод студэнтаў факультэта, прыцягвае перспектыўных маладых даследчыкаў у галіну этналогіі. Экспедыцыі ладзяцца ў цікавейшыя куточкі Беларусі: Белавежская пушча, ваколіцы Мірскага замка, Беларускае Палессе, беларуска–літоўскае памежжа і інш.

Палявыя этнаграфічныя даследаванні на гістарычным факультэце пачалі праводзіцца яшчэ з ліпеня 1998 г. разам з археолагамі на Браслаўшчыне. Тады была створана спецыяльная група, якая займалася зборам этнаграфічных матэрыялаў. Яе ўдзельнікамі праводзілася вывучэнне традыцый харчавання, радзінных звычаяў і абрадаў беларусаў, народнай педагогікі і інш. Вынікі даследавання былі прадстаўлены на навукова–практычнай канферэнцыі ў горадзе Браслаў і надрукаваны ў «Браслаўскім сшытку».

Пасля стварэння ў чэрвені 2001 г. кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў пачаліся праводзіцца самастойныя палявыя этнаграфічныя даследаванні. На працягу 20 год кіраўніком этнаграфічных экспедыцый з’яўляецца доктар гістарычных навук, прафесар Т.А. Навагродскі. Разам з ім працуюць І.С. Махоўская (2001–2007), С.А. Захаркевіч (2008–2017), І.У. Алюніна (2009–2015), І.Г. Бачыла (2016–2017). У палявых даследаваннях прымаюць удзел студэнты, магістранты і аспіранты кафедры.

У 2001–2003, 2005 і 2008 гг. палявыя даследаванні па традыцыях харчавання і вуснай гісторыі мясцовых жыхароў праводзіліся ў гарадскім пасёлку Мір Карэлічскага раёна Гродзенскай вобласці, а таксама ў вёсках Вялікае Сяло, Прылукі, Засценак, Міранка, Аюцавічы, Сімакава, Возерскае гэтага ж раёна. Даследаванні ў гарадскім пасёлку Ружаны Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці, а таксама ў навакольных вёсках былі праведзены ў ліпені 2004 г. Летам 2006 г. этнаграфічныя матэрыялы па зменах у традыцыях харчавання збіраліся ў вёсках Гольчыцы, Кулікі, Барок, Ржэўка, Вынішчы, Кальчыцы, Копань, пасёлку Нява Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Вёскі Дзмітравічы, Каменюкі, Вялікалессе, Чарнакі, Чвіркі, Падомша, Хамуціны, Панасюкі, Падбела, Пашукі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці вывучаліся ў ліпені 2007 г.

Збор палявога матэрыялу па традыцыях харчавання летам 2009 г. ажыццяўляўся ў вёсцы Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Па загадзя распрацаванаму апытальніку студэнты ажыццяўлялі апытанне мясцовых жыхароў па традыцыйнай культуры насельніцтва Палесся. Вынікам дадзенага даследавання сумесна з Беларускім грамадскім аб’яднаннем «Адпачынак у вёсцы» і пры фінансавай падтрымцы Міжнароднай арганізацыі па рэгіянальнаму развіццю была падрыхтавана і выдадзена праца «Народная кухня маталян», прэзентацыя якой адбылася ў жніўні 2009 г. на фестывалі «Мотальскія прысмакі 2009».

Чарговая летняя экспедыцыя кафедрай этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў у 2010 г. ладзілася у вёску Тышкавічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Тэрыторыя беларуска–літоўскага памежжа даследавалася ў ліпені 2011 г.: матэрыялы збіраліся ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці ў вёсках Гальчуны, Гелюны, Гервяты, Рымдзюны, Пелігрында, Петрыкі і інш.

У ліпені 2012 г. палявыя этнаграфічныя даследаванні былі паспяхова праведзены ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці, а ў ліпені 2013 г. – у горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці. Вёскі Стары Лепель і Юркаўшчына Лепельскага раёна гэтай жа вобласці сталі аб’ектам вывучэння падчас працы ў экспедыцыі ў ліпені 2014 г.

Палявыя этнаграфічныя матэрыялы па народнай культуры жыхароў вёсак Слабодка, Завер’е, Вусце, Гаўрылава, Луні, Кірылава Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці збіраліся ў ліпені 2015 г. [2, с. 26–27].

У 2016 г. чарговая экспедыцыя праходзіла ў Барысаўскім раёне Мінскай вобласці. Базай яе правядзення стала вёска Мсціж, якая знаходзіцца непадалёк ад Віцебскай вобласці і мае цікавую і

багатую гісторыю. Першае ўпамінанне пра Мсціж адносіцца да XIV ст. У розныя часы маёнтак знаходзіўся ва ўласнасці Радзівілаў, Тышкевічаў, Сапег, Храптовічаў, і нарэшце Слізняў, якія з другой паловы XVIII ст. сталі адзінымі ўладальнікамі маёнтка. Менавіта яны адбудавалі тут дваранскую сядзібу, рэшткі якой захаваліся да нашага часу. Даследаванні праводзіліся не толькі ў самой вёсцы Мсціж, але і ў бліжэйшых населеных пунктах. Гэта вёскі Мрай, Волакі, Макаўе, Халмоўка, Загор’е, Гаражанка, Собалеўка, Ніўкі, Броды, пасёлак імя Вароўскага. За перыяд працы ў Мсціжскім краі было апытана больш за 50 інфармантаў. Сабраны матэрыял прадстаўлены на 288 старонках, зроблена больш за 150 фотаздымкаў. Этнаграфічныя экспанаты, а сярод іх сталярныя інструменты, ручнікі, ночвы, былі перададзены ў дар Мсціжскай сярэдняй школе. Каштоўным экспанатам, знойдзеным падчас дадзенай экспедыцыі, стаў праваслаўны абраз, атрыманы ад мясцовай пажылой жыхаркі. Яго па завяршэнні палявых даследаванняў супрацоўнікі кафедры перадалі для правядзення атрыбуцыі і далейшага захавання ў Нацыянальны гістарычны музей Беларусі.

Экспедыцыя 2017 г. была прысвечана стогадоваму юбілею вывучэння вічынскіх палян І.А. Сербавым. Даследчык унёс значны ўклад у этнаграфічнае вывучэнне Беларусі. Ён быў адным з першых этнографаў, які ўслед за М.Я. Нікіфароўскім, А.К. Сержпутоўскім і Е.Р. Раманавым надаваў вялікую ўвагу вывучэнню вытворчай дзейнасці і матэрыяльнай культуры беларускага сялянства. Ісаак Абрамавіч быў пастаянным удзельнікам усіх фальклорна–этнаграфічных экспедыцый Акадэміі навук БССР [3, с. 4]. Адной з грунтоўных прац І.А. Сербава, матэрыял для якой збіраўся і апрацоўваўся аўтарам яшчэ ў дарэвалюцыйны час, з’яўляецца этнаграфічны нарыс «Вічынскія паляне» (1928). Перавыданне гэтай кнігі стала магчымым дзякуючы намаганням прафесара Т.А. Навагродскага, а таксама спонсарскай падтрымцы і шчырай зацікаўленасці выхадца з тых мясцін (в. Дварэц Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці) У.І. Пясоцкага.

Тадэвуш Антонавіч Навагродскі асабіста ўжо бываў у этнаграфічных экспедыцыях у дадзенай мясцовасці. Таму вырашыў прывезці ў гэтае надзвычай цікавае і гістарычнае месца студэнтаў–першакурснікаў. Матэрыялы па зменах і трансфармацыі традыцыйнай культуры мясцовых жыхароў збіраліся ў вёсках Вічын, Дварэц, Дрэбск, Яжаўкі, Язвінкі, Сасноўка, Кажан–Гарадок Лунінецкага раёна. Падчас экспедыцыі было зроблена некалькі сотняў фотаздымкаў і набыта звыш 50 этнаграфічных прадметаў. Сярод іх вышываныя ручнікі, элементы традыцыйнага жаночага касцюмнага комплексу, керамічныя вырабы, керасінавая лямпа, маслабойка, прас, кафямолка даваеннага часу. Сабраны і апрацаваны матэрыял агульным аб’ёмам 342 старонкі падрыхтаваны да друку. Група студэнтаў–практыкантаў спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка–культурнай спадчыны», акрамя ўдзелу ў палявой працы, мела магчымасць папрацаваць у Лунінецкім раённым краязнаўчым музеі, куды ў тым ліку была перададзена частка экспанатаў, сабраных у мясцовых жыхароў.

Больш чым за 15 гадоў палявых даследаванняў кафедрай былі сабраны багацейшыя, каштоўнейшыя матэрыялы. Частка з іх ужо надрукавана: «Народная кухня маталян. Кулінарныя традыцыі Беларускага Палесся» (2009), «Кулінарная спадчына Белавежжа» (2010), «Народная кухня тышкаўцоў» (2010), «Народная кухня Семежава» (2013). Яны з’яўляюцца каштоўнай крыніцай для далейшага вывучэння розных аспеткаў культуры беларусаў, актыўна выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы навуковых работ рознага кшталту: дыпломных праектаў, кандыдацкіх дысертацый. За гэты час кандыдацкія дысертацыі паспяхова абаранілі даследчыкі, якія ў свой час былі актыўнымі ўдзельнікамі штогадовых летніх экспедыцый, некаторыя прыймаюць у іх удзел і зараз: М.А. Міхайлец, А.Д. Якубінская, В.Э. Барташ, К.А. Шумскі, С.А. Захаркевіч, І.У. Алюніна, І.Г. Бачыла.

Вопытным «палевіком», досвед працы ў «полі» якога налічвае ўжо больш за 25 гадоў (пачынаючы з 1992 г.), з’яўляецца прафесар Т.А. Навагродскі. Чвэрць стагоддзя даследчык у розных куточках Беларусі актыўна збірае матэрыялы па традыцыях харчавання. У ходзе палявых этнаграфічных даследаванняў ён імкнецца найбольш поўна і падрабязна запісаць рэцэптуру страў і тэхналогію іх прыгатавання, звяртае ўвагу на прадметы хатняга начыння, посуд, фіксуе кулінарную тэрміналогію, нярэдка назірае за працэсам прыгатавання. Напрыклад, у ліпені 2013 г. у г. Глыбокае Віцебскай вобласці ім была зафіксавана падрабязная тэхналогія прыгатавання такіх страў, як: грыбная поліўка, марцыпан, капытка, клёцкі з душамі і інш.

Палявыя матэрыялы былі пакладзены даследчыкам у аснову яго публікацый. А іх у навукоўца ўжо больш за 100. Т.А. Навагродскі распрацаваў сучасны тэарэтычны падыход да даследавання традыцый харчавання беларусаў, вылучыў структурныя часткі традыцыйнай культуры харчавання, увёў у навуковы зварот багаты фактычны матэрыял.



ПолесГУ

Кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў паспяхова ажыццяўляе міжнароднае супрацоўніцтва. Летам 2017 г. група студэнтаў выпускнога курса пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка І.Г. Бачыла прымала ўдзел у праекце «Сінагогі Беларусі», які ладзіўся сумесна з Акадэміяй мастацтваў г. Вільнюса (Літва). За час беларуска–літоўскай экспедыцыі па Беларускаму Палессю вялося вывучэнне сінагог у Століне і Кобрыне Брэсцкай вобласці, спецыяльна даследавалася культура мясцовых жыхароў – жыллё, традыцыі харчавання, міжэтнічныя ўзаемаданосіны беларусаў і яўрэяў.

Такім чынам, праца ў «полі» па–ранейшаму застаецца надзвычай важнай і запатрабаванай часткай этналагічных даследаванняў. Этнолагі кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ плённа працуюць на ніве падрыхтоўкі спецыялістаў, якія грунтоўна валодаюць навыкамі палявой работы і асабіста прымаюць актыўны ўдзел у зборы матэрыялаў у ходзе палявых этнаграфічных даследаванняў.

**Спіс літаратуры**

1. Громов, Г. Методика этнографических экспедиций / Г. Громов. – М. : Изд–во Московского университета, 1966. – 119 с.

2. Навагродскі, Т.А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX – XX стст. / Т.А. Навагродскі. – Мінск : БДУ, 2015. – 243 с.

3. Сербаў, І.А. Вічынскія паляне: матэрыяльная культура: этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся / прадм. Т.А. Навагродскі, Я.А. Пясцокая. – Мінск : БФК, 2005. – 88 с.

**Рэзюмэ.** Авалодванне навыкамі палявых даследаванняў з’яўляецца неад’емнай часткай у працэсе падрыхтоўкі прафесійных этнолагаў на кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ. З самага пачатку існавання кафедры (2001 г.) яе выкладчыкі рэгулярна ладзяць палявыя этнаграфічныя даследаванні ва ўсіх гістарычна–этнаграфічных рэгіёнах Беларусі. Правядзенню кожнай экспедыцыі папярэднічае падрыхтоўчая праца, якая праходзіць у некалькі этапаў. Падчас палявых этнаграфічных даследаванняў іх удзельнікамі выконваюцца розныя віды работ: асабістае назіранне, апытанне мясцовых жыхароў, збор этнаграфічных прадметаў, фотафіксацыя і інш.  Больш чым за 15 гадоў былі сабраны багацейшыя матэрыялы. Частка з іх ужо надрукавана.

**Abstract.** Mastering the skills of field research is an integral part in the process of professional ethnologists training at the department of ethnology, museology and history of arts of the faculty of history of BSU. From the very beginning of the department (2001) its workers regularly organize field ethnographic research in all historical and ethnographic regions of Belarus. Each expedition is preceded by preparatory work, which consists of several stages. During the field ethnographic research, the participants carry out various types of work: personal observation, communication with local residents, collection of ethnographic objects, photo–recording. For more than 15 years, rich materials have been collected. Some of them have already been published.

**BACHYLA I.G.,** Cand. of Hist. Sc.,
Senior Lecturers of the Department of Ethnology, Museology and History of Arts,
the BSU faculty of history, Minsk, Republic of Belarus

## THE DEPARTMENT OF ETHNOLOGY, MUSEOLOGY AND HISTORY OF ARTS: AN EXPERIENCE OF ETHNOGRAPHIC RESEARCH IN THE «FIELD»

*The article is devoted to the activities of the department of ethnology, museology and history of arts in conducting ethnographic research in the «field». The author describes the relevance, technique and them of the expeditionary work, reveals its geography, basic results of the work, an introduction to the published materials.*

***Keywords:*** *ethnology, the ethnographic research in the «field», expedition, department of ethnology, museology and history of arts, Belarus.*



Полесгу

**References**

1. Gromov, G. *Metodika etnograficheskih expediciy* [Methods of ethnographic expeditions]. Moscow, Moscow University publ., 1966. 119 p. (In Russian).

2. Navagrodski, T.A. *Evalyutsya tradytsiy harchavannya belarusau u XIX – XX stst.* [Evolution of eating habits traditions of Belarusians in the XIX – XX centuries]. Minsk, BSU, 2015. 243 p. (In Belarussian).

3. Serbau, I.A. *Vichynskiya palyane: materyal'naya kultura: etnagrafichny narys Belaruskaga Palessya* [Palyane of Vichyn: material culture: ethnographic essay of the Belarusian Polesye]. Minsk, BFC, 2005. 88 p. (In Belarussian).

*Received 28 March 2018*

ПолесГУ